# ЦЁТКА
# (АЛАІЗА ПАШКЕВІЧ)

В.Ч. Хвайніцкая

**Родная мова,**
**быццам цэмент,**
**звязвае людзей.**
**Яна дае ім**
**найлепшы спосаб**
**разумець адзін аднаго,**
**адной думкай жыць,**
**адной долі шукаць.**







# Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч

Нарадзілася 15 ліпеня 1876 года ў фальварку Пяшчына (Пешчын, маёнтак Стары Двор; цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці) у шматдзетнай шляхецкай сям'і (два браты і тры сястры).

Пэўны час дзяўчынка выхоўвалася ў дзедавай сям'і ў фальварку Тарэсін, дзе яе выхаваннем займаліся бабуля Югася і нянька Агася.

Уражлівая і чулівая дзяўчынка захаплялася народнымі песнямі, казкамі. З ранніх год цягнулася да кнігі.

Алаіза пачынала навуку дома з дапамогай «дарэктараў».

Вучылася дзяўчынка старанна, таму ў 1884 годзе паступіла адразу ў 4-ы клас Віленскага прыватнага сямікласнага вучылішча Веры Міхайлаўны Прозаравай.

Плата за навуку была вельмі высокая (100 руб. на год), але за вельмі старанную і добрую вучобу Алаізе прызначылі стыпендыю.

У 1901 годзе, пасля заканчэння гімназіі, адну зіму будучая пісьменніца працавала ў вёсцы хатняй настаўніцай.



**У 1902 годзе Алаіза накіравалася ў Пецярбург, каб працягнуць адукацыю.**

**У Пецярбургу А. Пашкевіч вучылася на курсах выхавацелек і кіраўніц фізічнай адукацыі, наладжаных вядомым вучоным, прафесарам Пятром Францавічам Лесгафтам, а ў 1902-1904гг. скончыла гімназію Александроўскай.**

**Атрыманыя веды па медыцыне, гігіене, педагогіцы і батаніцы паспяхова выкарыстоўваліся ёю ў жыцці.**

**Падчас яе вучобы ў Санкт-Пецярбургу аформіўся і дзейнічаў гурток студэнтаў-беларусаў «Круг беларускай народнай прасветы».**

**А.Пашкевіч была яго актыўным удзельнікам. Асяроддзе гэтага гуртка шмат у чым вызначыла яе грамадзянскую пазіцыю:**

- **актыўная барацьба з царызмам;**
- **сацыяльнае вызваленне працоўных;**
- **нацыянальнае вызваленне беларусаў.**

**У выданнях «Круга беларускай народнай прасветы» ўбачылі свет першыя друкаваныя творы паэткі: «*Мужык не змяніўся*», «*Музыкант беларускі*».**

А.Пашкевіч мела намер паступаць у Пецярбургскі ўніверсітэт, але пакінула горад, у тым ліку і па прычыне небяспечнага для яе здароўя клімату.

Цётка апынаецца ў Вільні, дзе разгортваецца яе рэвалюцыйная дзейнасць. Вершы «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандартам», выдадзеныя ў 1905 годзе ананімна, распаўсюджваліся сярод рабочых як лістоўкі.

**У 1905 годзе была дэлегатам ад беларускіх жанчын на жаночым з’ездзе ў Маскве.**

**З 1906 года пачынаюцца эміграцкія вандроўкі паэткі.**

# Студэнцкая кніжка А.Пашкевіч

З 1907 да 1911 гг. А.Пашкевіч праходзіла вучобу на гістарычна-філалагічным факультэце Львоўскага ўніверсітэта.

Пазней, з 1908 па 1909 гг., А. Пашкевіч жыла ў Кракаве, дзе вучылася на гуманітарным аддзяленні Ягелонскага ўніверсітэта.






**У 1906 годзе ўбачылі свет паэтычныя зборнікі «Скрыпка беларуская»** (пад псеўданімам Гаўрыла з Полацка) **і «Хрэст на свабоду»** (пад псеўданімам Гаўрыла).

**Зборнікі выйшлі на кірыліцы і лацінкай (канец 1905 – пачатак 1906 гг.).**

**Вершы ў зборніках яскрава адлюстроўвалі тагачасныя рэвалюцыйныя настроі беларускай інтэлігенцыі.**



Вокладка часопіса «Лучынка» (1914)

У лютым 1912 года Алаіза Пашкевіч выходзіць замуж за літоўскага інжынера

**Сцяпонаса Кайрыса.**

Прозвішча мужа дазволіла ёй зноў вярнуцца ў Вільню. Там Алаіза ўдзельнічала ўва ўсіх значных мерапрыемствах культурна-асветніцкага характару, нават іграла ў некаторых спектаклях трупы Ігната Буйніцкага, друкавалася ў беларускіх выданнях.

Калі ў 1914 годзе ў Мінску стварыўся першы дзіцячы беларускамоўны часопіс «Лучынка» стала яго галоўным рэдактарам.

Фактычна была рэдактарам часопіса для моладзі «Лучынка»


Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год VI. Вільня 6 Студня (Января) 1911 г. № 1.

НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вуліца, д. № 20

Цэна з пересылкай і дастаўкай да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Хто не здалее адзін плаціць за „Нашу Ніву“, хай знойдзе ещчэ колькі людзей і выпішэ газэту хаўрусам.
Хто спагадае справе адраджэньня нашаго народу, нехай падтрымае нашу працу і падпішыцца на „Нашу Ніву“.

VI год выданьня Прыймаецца падпіска год выданьня VI

НА 1911 ГОД

— НА ЕДЗІНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ —

„НАША НІВА“

Хто жадае лепшай долі беларускаму народу нехай выпісывае, чытае сам і шырыць між людзей, беларускую газэту.

Каштуе з дастаўкай і перасылкай:

На ўвесь год толькі . . . . . . 2 руб. 50 кап.
На поўгода . . . . . . . . . . 1 „ 25 „
На 3 месяцы . . . . . . . . . — „ 65 „

Хто вышле грошы адразу за ўвесь год, дастане у прыдатку Беларускі календар на 1911 год, а за прыплату 50 кап. „Гісторыю Беларусі“ Власта.

# Алаіза Пашкевіч мела дачыненне да выдання газет «Наша ніва» і «Наша доля»


№5.

Год I.

НАША ДОЛЯ

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литарами.

Адрэс рэдакции и администрации: Вильня, Катэдральны плац, № 4.

Тэлефон Рэдакции и Канторы № 591.

Усюду кроу.

Да чытацелеу.



З вясны да восені 1915 года А.Пашкевіч як сястра міласэрнасці даглядала хворых у тыфозным бараку Віленскага ваеннага шпіталя.

Шмат намаганняў прыкладала для арганізацыі беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў у Вільні, дапамагала ў стварэнні прытулкаў. Была выкладчыкам на першых Віленскіх беларускіх настаўніцкіх курсах (1915).

Дзякуючы намаганням Алаізы Пашкевіч, Баляслава Пачобкі і пры ўдзеле Сабіны Іваноўскай у Вільні 13 лістапада 1915 года была адкрыта першая беларуская школа (на Юр’еўскай вуліцы).



У 1916 годзе Аліза Пашкевіч прыехала на пахаванне бацькі і засталася на некаторы час ратаваць сваіх блізкіх і землякоў ад тыфу.

Дапамагаючы хворым, пісьменніца сама заразілася гэтай хваробай.

Аслаблены сухотамі і голадам, арганізм не адолеў хваробы. Памерла Цётка ў Старым Двары, на радзіме, у ноч на 5 лютага 1916 года.

Пахавалі пісьменніцу на могілках у родным Старым Двары.

# Ушанаванне памяці




## ПАМЯЦЬ

У родным горадзе паэтэсы усталяваны яе помнік.
У 1976 годзе беларускія мастакі Рыгор Іваноў і Святлана Гарбунова зрабілі медалі і медальён у гонар Алаізы Пашкевіч.
У 1991 годзе быў зняты чатырохсерыйны мастацкі фільм «Крыж міласэрнасці», прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху Алаізы Пашкевіч (Беларусьфільм).
Песня «Кася» поп-гурта "Сябры" напісаная на верш Цёткі «Лета».







# Літаратурныя крыніцы


1. **Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч і інш. ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіч, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – С. 105-132.**
2. **https://be.wikipedia.org/wiki/Алаіза_Пашкевіч**